Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztową uiszczono ryczałtem.

РЭХА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 9 Вільня, Субота 29-га верасьня 1928 г. Год 1

Па загаду Гарадзкога Старасты № 8 газ. „Рэха Працы“ канфіскаваны за перадавіцу „40.000“, у якой паданы і вытлумачаны факты нядаўняй удачнай забастоўкі ў Лодзі і карэспанд.: „Акружны Зьезд Т-ва Беларускай Школы ў Косаве“ з падачай рэзалюцыі.

Скамарохі*).

Як вядома, „Kurjer Wileński“ зьяўляецца органам дробнай шляхты на беларускіх землях, якая цалком лічыцца санацыйнай, ці належыць да групаў урадовых. Спаўняючы фактычную роль даўнейшых гайдукоў пры вялікіх дварох, або складаючы пачэсную варту ў вялікіх магнатаў—гэтая шляхта ў нашыя часы, як і раней, мае, як здаецца, сваім заданьнем курыць фіміямы і граць на гусьлях сваім паном, а пры гэтым выабражаць, што іх слухаюць і што яны вельмі нешта значаць. Але час паказаў, што з слугамі, хоць і „рыцарскімі“ — мала лічацца і, здаецца, што курвіленцы цяпер зусім задаволены сваей роляй скамарохаў і, ня імкнучыся да направы абставінаў у сваім духу, ужываюць хіба ўсю энэргію, каб даказаць, што іх паны—найлепшыя і што пры іх настаў рай, ня толькі для „рыцараў“ і скамарохаў, але і для іншых „падданых“. Што да „курвіленцаў“, то гэтымі „падданымі“, „кмёткамі“, зьяўляюцца ясна-ж — беларускія сяляне і работнікі, а найпаважнейшымі— беларуская інтэлігенцыя.

Якраз такую скамарошую песьню пяе ў перадавіцы „Obecny stan szkolnictwa białoruskiego“ ў № 220 „Kurjera Wil.“ — ведамы вельмі беларускай інтэлігенцыі п. С. В.

Праліваючы кракадылевы сьлёзы над перадмаёвым палажэньнем беларускае школьнае справы, п. С. В. сіліцца даказаць, што ўсё ў гэтым сэньсе радыкальна зьмянілася пасьля маю. Пяро навасьпечанага і няпрошанага абаронцы піша: „Прадмаёвыя Урады імкнуліся да паступовае ліквідацыі беларускае школы, ствараючы варункі, у каторых школьная праца была проста немагчымай“, а вось пасьля маю прышла і „sanacja i w szkolnictwie białoruskim“.

Мы пакуль што маем — ліквідацыю Радашкавіцкай Гімназіі і пагрозу Клецкай, „завешаньне“ і „адвешаньне“ Галоўнай Управы Т-ва Бел. Школы, ды звальненьне з Віленскай Беларускай Гімназіі найлепшых вучыцялёў з заменаю іх „санацыйнымі“. Чым гэта розьніцца ад прадмаёвага адношаньня да нас—ведама хіба толькі скамарохам з „Kur. Wileńsk.“.

Для нас ясна, што імкненьні да беларускае школьнае справы асталіся тыя-ж самыя і што толькі цяперашняя „санацыя“, дзе кіруюць, ясна, не скамарохі - курвіленцы, а п. п. Радзівілы ды Мацкевічы — хоча толькі засланіць сваю рэакцыйнасьць тым, што кідае на пацеху галоднай беларускай інтэлігенцыі пэўныя косьці са стала ў родзе наданьня матуры некаторым гімназіям і такім чынам сеяць ілюзіі (пустыя надзеі) сярод беларускіх працоўных гушчаў аб сваей палітыцы „роўнаўпраўненьня беларускіх працоўных масаў“ і дабрадзейства ў іх бок.

Але скамарохі ў адносінах да сваіх шэфаў (начальства),—у адносінах да беларускіх сялян і работнікаў курвіленцы лічаць сябе „панамі“ і „робяць палітыку“.

На гэты раз нашым скамарохам хоцзіць аб скампраміпаваньні запраўдных прыхільнікаў народу і яны пачынаюць крычаць, што „dorwali się do władzy i decydującego wpływu jednostki ultra radykalne, które postarali się uczynić z T-wa Szkoły Białoruskiej oraz podwładnych mu organizacji teren swej działalności wybitnie antypaństwowej“. Дрэнны вучыцель між публіцыстаў і ня лепшы публіцысты між вучыцялёў, п. С. В. ведае добра, што Т-ва Бел. Школы было і ёсьць арганізацыяй чыста культурна-асьветнай, але яна мае ў сваіх радох тысячы беларускіх сялян і работнікаў, дык брэдні аб антыпанствовасьці служаць толькі выяўленьнем жаданьня апанаваць гэтую інстытуцыю і зрабіць з яе прыладу, патрэбную сабе.

Але, калі на скамарохаў мала зважаюць паны, тым болей ня будуць слухаць іх і беларускія працоўныя гушчы. Мы пэўныя, аднак, што гэтыя правакацыйныя штучкі і ашуканчыя манэўры немаральнага санатара-скамароха ня здолеюць атуманіць нацыянальнай сьведамасьці беларускіх працоўных гушчаў і зноў у адказ на атакі буржуазіі і іх „рыцарскіх“ служкаў, як і беларускай угоды, адкажуць масавым і салідарным выступленьнем з дамаганьнем роднай школы. Адказ няпрошаным прыяцелям (з каменем за пазухай) беларускія сяляне і работнікі дадуць масавым складаньнем дэклярацыяў з дамаганьнем дзяржаўных беларускіх школ, здаючы сабе гэтым самым справу, што гэта яны здабудуць толькі шляхам барацьбы за свае агульныя справы.

*) Музыканты, шуты ў даўнейшых княскіх дварох.

Небясьпека фашыстаўскага перавароту у Аўстрыі.

Унутраныя сацыяльна-палітычныя адносіны ў Аўстрыі ўсьцяж завастраюцца. Рэакцыйныя сілы, якія працуюць на цямнейшым груньце—сярод вясковага сялянства, усьцяж кансалідуюцца, маючы значнае падтрыманьне ў цэнтральным урадзе кс. Зэйпля. Наадварот — у местах, у якіх самаўрады, пачынаючы з сталічнага, амаль не цалком захопленыя сацыялістамі, групуюцца больш прагрэсыўныя, радыкальныя элемэнты, з работніцкай клясай на чале. На гэтай супярэчнасьці ў краі, у якім работнікі і сяляне не навучыліся падаць адны адным руку, каб злучыцца ў супольнай барацьбе за свае супольныя інтарэсы, чаму віною, пэўна-ж, „сацыялістычныя“ павадыры, — спрытна будуе свае панаваньне ў краі рэакцыйны ўрад ксяндза Зэйпля. Але, як паведамляе нямецкая сацыялістычная прэса, за плячыма ўраду ўсьцяж гуртуюць свае сілы — фашысты-манархісты. У апошнія дні ў Карынтыі адбыўся сэкрэтны зьезд манархічных павадыроў, у якім прыймаў учасьце навет сын былога наступніка баварскага пасаду Рупрэхта — прынц Альбрэхт. Сацыял. прэса цьвердзіць, быццам кіраўніцтва манархічнай акцыяй ў Аўстрыі ўзялі ў свае рукі баварскія манархісты. Прынц Альбрэхт прыехаў у Аўстрыю пад фальшывым пашпартам.

Венская прэса ўсьцяж робіць рэвэляцыі — з абодвух бакоў — аб сталым павялічэньні збраеньняў дзьвюх варожых баявых арганізацыяў — сацыял-дэмакратычнага „Шутцбунду“ і хрысьціянска-дэмакратычнага „Гэймвэру“.

На дзень 7-га кастрычніка назначаны зьезд дэлегатаў гэтага „Гэймвэру“ ў Вінэр-Нейштаце, — у самым прамысловым цэнтры ніжняй Аўстрыі. У зьезьдзе мае прыняць учасьце каля 18.000 сяброў „Гэймвэру“. У часе працы зьезду ўся армія „Гэймвэру“ па ўсяму краю мае трываць у поўнай баявой гатоўнасьці — на выпадак якіх сутычак з „Шутцбундам“, з'арганізаваных работніцкай клясай. Сацыялістычная прэса Аўстрыі слушна б'е трывогу, даводзячы, што самая думка аб скліканьні такога зьезду ў цэнтры работніцкага руху зьяўляецца правакацыяй. І — дзеля таго — сацыялісты склікаюць на той-жа дзень 7 кастрычніка ў тое-ж места Вінэр-Нэйштат зьезд свайго „Шутцбунду“...

Лібэральная прэса ў Вене выражае трывогу, прадбачачы слушна, што з усяго гэтага няўхільна дойдзе да крывавых падзей— тым больш, што абедзьве арганізацыі азброены навет кулямётамі, амаль што — не гарматамі... Лібэральная незалежная прэса трэбуе, каб урад забараніў аднолькава абодва зьезды дый змусіў да разбраеньня абедзьве арганізацыі. Але ўрад яўна, ці скрыта, але бясспрэчна, падтрымлівае „Гэймат-бунд“, які мае „звольніць край ад сацыялістычнай заразы“.

Венская прэса надчырківае, што зьезд у Вінэр-Нэйштаце можа аказацца толькі першым крокам, за якім падзеі могуць пайсьці вельмі шпаркім тэмпам, але ў кірунку, можа ня зусім пажаданым навет „хрысьціянскімі сацыялістамі“ кс. Зэйпля... Узброеныя масы могуць апанаваць фашысты-манархісты, якія даўно падрыхтаваліся быццам да „маршу на Вену“ — узорам Мусоліні, — каб там разагнаць парлямант і захапіць дыктатуру ў краі.

Трэба сказаць, што ўсё гэта — больш, як магчымая рэч. Бо-ж Аўстрыя робіцца ўсё больш — па свайму міжнародаваму палажэньню і акружаючых яе „апэтытах“ і ўплывах вялікіх дзяржаваў — падобнай да Літвы, ці Альбаніі. Кожная з канкуруючых за „сэрца і волю“ Аўстрыі вялікіх дзяржаваў гатова пайсьці ў краі—на „падтрыманьне сваіх уплываў“ — „на вялізарныя ахвяры“... сваімі грошамі і аўстрыяцкай крывёй...

Дзеля таго — з асаблівай трывогай трэба глядзець на тое, што робіцца ў гэтым усьцяж правакаваным з усіх бакоў краі.

Развал англійскага габінэту — „апошніх кансэрватараў“.

(„Сабачая старасьць“ англійскага кансэрватызму).

Некалькі месяцаў астаецца ўжо да новых выбараў у Англіі, а сучасны англійскі кансэрватыўны ўрад, які існуе ўжо чатыры гады, не дацягне, відаць, навет да выбараў, але—развальваецца на нашых вачох. Дый развальваецца, як гэта ня дзіўна гучыць, — ад старасьці!—Ад старасьці ды хворасьці пасобных міністраў, дый, так сказаць, ад „сабачай старасьці“ англійскай кансэрватыўнай партыі.—Бо на мейсца выходзячых „у тыраж“ міністраў партыя папросту ня мае людзей— на іх замену!

Перадусім з габінэту Балдвіна выходзіць „слаўны“ Бальфур, які мае — аж 82 гады, дый ужо некалькі месяцаў, як ня прымае ніякага ўчасьця ў працах ураду. Але, праўду кажучы, гэты лёрд Бальфур сядзеў у габінэце Балдвіна толькі „дзеля прэсьціжу“ (павагі), бо ня меў ніякага партфэлю, займаючы толькі ганаровае становішча „лёрдастаршыні Рады“.

Цяпер, гэта зволненае ганарова-нячыннае мейсца рыхтуецца быццам заняць змучаны ды расхварэлы Чэмбэрлен, які кідае становішча міністра заможных спраў дый — агульнае кіраўніцтва ўсей палітыкай габінэту, як фактычна яго запраўдны прэм'ер. Каб Чэмбэрлен мог заняць мейсца Бальфура, англійскі кароль мае—па празіцыі Балдвіна— зрабіць яго так-званым „пэрам“, ці лёрдам. Гэта значыць, што ўсьлед за Бальфурам фактычна пападзе „ў архіў“ і сам Чэмбэрлен. Абодва галоўныя „слупы“ габінэту і наагул— кансэрватыўнай партыі—перастаюць быць яе працаўнікамі.

Трэці „слуп“ габінэту і партыі, лёрд Бэркэхэд кідае палітычную дзеяльнасьць наагул дый пераходзіць у „сьвет вялікіх інтарэсаў“. Ён мае заняць становішча старшыні вялізарнага трэсту (тэлеграфна-радыёвага) з капіталам у 50 мільён. фунтаў (250 мільён. даляраў!), а адначасна і—старшыні вялізарнага газэтна-выдавецкага таварыства, якое трымае ў сваіх руках 3 вялікія сталічныя газэты ды 100 меншых правінцыяльных. Выходзіць з складу габінэту і марскі міністар Брыджмэн, які навет зьняў згары сваю кандыдатуру ў заканадаўчыя палаты на новых выбарах.

Заявілі аб сваім выхадзе таксама і — лёрд Солсбэры афіцыяльны „лідэр“, (павадыр) урадавай партыі ў палаце лёрдаў (сустаўная польскаму Сэнату т. зв. „верхняя палата“ парляманту). Выходзяць — міністар працы Артур Мэтлэнд і мін. гандлю Філіп Лістэр. Такім чынам, з больш-менш выдатных палітыкаў астаецца пакуль-што ў лоне ўраду, ня лічучы самога Балдвіна, (даволі бяздарнай асобы),—толькі мін. скарбу Чэрчыль, мін. калёніяў Амэры, дый больш галосны, як запраўды выдатны, мін. унутраных спраў Джойнсон Гікс, слаўны сваей ненавісьцяй да работнікаў-сацыялістаў і камуністаў.

Навет прыхільнікі англійскіх кансэрватараў прызнаюць, што „запасы, з якіх прэм'ер сучаснага ўраду можа набраць заступнікаў на мейсцы гэтых міністраў,—вельмі ўбогія“ (адкуль узята большасьць паданых фактаў „Кур. Варш.“ карэспанд. з Лёндану 18. IX).

„Толькі два прозьвішчы высуваюцца з усей масы кансэрватараў, якая напаўняе ўрадавыя лаўкі абедзьвюх палатаў парляманту“, кажа гэты карэспандэнт. Гэта — ведамы добра ў Польшчы Хільтон Юнг, той самы, які двойчы прыяжджаў у Польшчу ратаваць польскія фінансы: першы раз перад першым крахам злотага Грабскага, а другі раз — пасьля краху. Другі больш-менш выдатны сябра кансэрватыўнай партыі—лёрд Мэльшэт, нядаўна зроблены лёрдам ды прыняўшы хрысьціянства, а перад тым называўшыся Альфрэдам Мондам.

Але неяк забіўча выглядае для кансэрватыўнай партыі тое, што абодва гэтыя найвыдатнейшыя асобы з яе палітычных фаховых рэзэрваў зьяўляюцца сябрамі партыі толькі „ад учарашняга дня“. — Хільтон Юнг — быў віцэ-мін. скарбу ў лібэральн. габінэце Льлёйд-Джорджа, а лёрд Мэльшэт таксама — толькі ў гэтым парляманьце перайшоў на бок кансэрватараў, але выбраны быў па лібэральнаму сьпіску, чаму празваны быў Ллёйд-Джорджам—Юдай-здраднікам. Абодва гэтыя дзеячы маюць заняць мейсцы міністраў — Хільтон—скарбу, Мэльшэт—гандлю.

Сучасны мін. скарбу Чэрчыль, таксама— даўнейшы лібэрал, здаецца, мае заняць замест Чэмбэрлена — мейсца кіраўніка заграничнай палітыкі Англіі. Такім чынам агульнае палажэньне ў новым—рэфармаваным кансэрватыўным габінэце Балдвіна палітычна і гаспадарча кіраўнічыя становішчы маюць заняць дзеячы, якіх „кансэрватыўныя пераконаньні“ ня ўнушаюць залішне вялікага даверра іх калегам па партыі, асабліва-ж—самаму прэм'еру Балдвіну: бо-ж залішне нядаўна яны „парвалі сувязь“ з лібэраламі!.. Інакш кажучы, найбольш выдатныя, найбольш надаючыся на міністраў, сябры кансэрватыўнай партыі зьяўляюцца якраз „найменш кансэрватарамі“, дый дзеля таго — ня маючымі ані даверра, ані сымпатыяў у ўрадавай большасьці абедзьвюх палатаў!.. Гэтым, як піша з Лёндану той-жа карэспандэнт, і тлумачыцца тое, што Балдвін — не сьпяшыць з пераменамі ў габінэце, заклінаючы ўсіх міністраў дасядзець ужо неяк да выбараў, не кампраміцуючы яго, прэм'ера, і ўсю кансэрватыўную партыю скандальным банкруцкім развалам габінэту — пры вялізарнай урадавай большасьці ў абедзьвюх палатах 414 пасло ў на агульную лічбу 615!! Якая-ж прычына таго, што — пры такой вялікай колькаснай сіле кансэрватыўнай партыі ў парляманьце — на вачох ўсяго сьвету раскрываецца такая якасная ўбогасьць гэтай партыі, якая трымае вось ужо 4 гады страшэнна рэакцыйны лад ня толькі ў краі, але і ўва ўсей Эўропе?! Першая прычына банкруцтва — „сабачая старасьць“ гэтага англійскага кансэрватызму. Але гэта—ня ўсё. Калі мы ўспомнім, што — побач з гэтым бясспрэчным, прызнаваным навет гарачымі прыхільнікамі англійскага кансэрватызму, яго развалам, адначасна, навет яшчэ раней—бо ўжо ў часе дзьвюх апошніх выбарных кампаніяў—сцьверджаны быў поўны занапад англійскай лібэральнай партыі, з якой, як мышы з тонучага карабля, уцякалі масова сябры—або направа — да кансэрватараў, або налева—у работніцкія партыі,—дык, прымаючы пад увагу ўсё гэта, трэба сцьвердзіць агульны занапад можа і ўсей буржуазнай сацыяльна-палітычнай ідэі ў Англіі,—так страшэнна скампраміпав. рэакцыйнай дзейнасьцяй яе „кансэрвы“ дый поўным бяссіль-

лем ле лібэралізму. Калі-ж дапусьціць гэта, дык ажацця, што незразумелая, побач з тым, большасьць, здабытая кансэрватарамі на выбарах, тлумачыцца толькі страхам, які ўнушаюць багатым буржуазным клясам—працоўныя клясы Англіі, якія ўсё больш забіраюць сілы і ўплыву ў краі, да якіх усьцяж далучаюцца ўсе найлепшыя, найбольш талентныя дый маральна-чыстыя асобы з розных клясаў, а перадусім—з фаховай працоўнай інтэлігенцыі.

З буржуазнага палітычнага карабля Англіі бягуць на ўсе бакі найвыдатнейшыя людзі: з кансэрватараў — „у архіў", з лібэралаў — да „Партыі Працы". Лёгка зразумець тады, як страшэнна баяцца кансэрватары набліжаючыхся выбараў; зразумела і тое, чаму так цягне з „перабудовай" свайго ўраду Балдвін, молячы, каб яго міністры — „паў-вябошчыкі" неяк дацягнулі ўжо да выбараў. Бо-ж, калі выбары дадуць „перамогу кансэрватарам", тады будзе лягчэй злажыць новы габінэт; калі дадуць паражэньне, дык „перабудова" будзе наагул непатрэбна...

Паражэньне на выбарах будзе фактычным разгромам партыі, будзе няхільным рэзультатам яе маральнага і палітычнага банкруцтва, якому цяпер бачна прыглядаецца масавы ангельскі выбаршчык, не гледзячы на ўсе штучкі Балдвіна. Але фатальнае палажэньне, у якое могуць паставіць Англію новыя выбары, зьмяшчаецца у тым, што, можа, найбольш верагодным іх рэзультатам будзе тое, што выбары не дадуць ізноў абсалютнай большасьці ні воднай партыі, як гэта было на выбарах у 1924 г. Бо-ж—і сіла работнікаў і іх прыхільнікаў расьце павольна і страх буржуазіі перад работніцкім урадам усьцяж стрымлівае шырокага буржуазнага выбаршчыка, ня гледзячы на банкруцтва яго павадыроў і іх праграм—ад галасаваньня за работніцкія сьпіскі. Такім чынам — ня прымаючы пад увагу шансаў на перамогу лібэралаў, трэба дапусьціць, што ва ўладу будуць канкураваць між сабой толькі кансэрватары і „лябурысты" (работніцкая „Партыя Працы"). Але трэба ўспомніць, што апошні кангрэс Работніцкай Партыі рашуча забараніў партыі браць на сябе тварэньне ўраду — без абсалютнай большасьці ў парляманце; відаць, спроба ўраду Мак-Дональда — у 1924 г. добра далася ў знакі партыі. „Партыя Працы" ня хоча больш урадаваць — з ласкі абедзьвюх буржуазных партыяў у парляманце дзе быць скінутай з міністэрскіх крэслаў, як толькі пачне рабіць першыя самастойныя крокі, дыктаваныя ёй уласнай яе праграмай!..

Такім чынам,—у разе няпоўнай перамогі на выбарах работніцкай партыі, — урадаваць ізноў маюць у Англіі маральна і палітычна збанкрутаваўш., наскрозь прагнілыя, дажыўшыя ўжо да „сабачай старасьці" — кансэрватары, самі ня верачы ні сабе, ні сваім найнамацнейшым прадстаўнікам, — як аднолькава, на абедва бакі — „Юдам лібэралізму"!!.

А што-ж гэта такое, як не распачаўшымся грунтоўны развал палітычнага жыцьця ангельскай буржуазіі, — рыхтуючы краю вялізарныя ўстрасеньні..

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Што ўвозіцца з заграніцы ў Польшчу.

Варшаўская санацыйная газэта „Głos Prawdy", абгаварваючы ад'емны таргоўы біляне Польшчы, пералічвае, якія тавары і на якую суму ўвозяцца ў Польшчу.

Як ведама, калі яшчэ ішла гутарка аб зямельнай рэформе і парцэляцыі маёнткаў— абшарнікі падымалі проціў гэтага страшэнны гвалт і даказвалі, што тады занікне земляробская культура, гарады будуць галадаць, бо-ж сяляне не дадуць на рынак столькі збожжа, сколькі даюць „культурныя" маёнткі, Польшча будзе заместа, як заўсёды, вывазіць, справаджваць збожжа і муку з заграніцы і т. д.—проста, па іх славах, меў-бы паўстаць канец сьвету.

Але ж зямельную рэформу не правялі, абшарнікі гаспадараць у „культурных" маёнтках і што ж аказваецца? Польшча ўвозіць збожжа з заграніцы і навет на аграмадныя сумы. Так ў працягу 7-мі месяцаў — студзень — ліпень 1927 г. увезена на 190,386 тысяч зл., у той час як вывезена ўсяго на 19,182 тыс.

За той-жа час гэтага году ўвезена на 154,758 тысяч і вывезена на 21,831 тысячу.

Увоз пераважаў вываз у сярэднім больш як у 8 разоў.

З гэтага відаць, што ў 80 прац. земляробскім краі штось не ў парадку—дзе-ж тое збожжа з „культурных" маёнткаў? Праўда, за восеньнія месяцы тых-жа гадоў больш вывезена збожжа, чым прывезена, але ж гэта пераважна сялянскае збожжа, якія, прыціснены падаткамі, вывозяць яго на рынак, не чакаючы на лепшую цану вясной, што могуць рабіць абшарнікі, якія ў любы момант атрымліваюць пазыкі на зваротак. Дробныя-ж сялянскія гаспадаркі гадуюць і прадаюць кароў і сьвіней, што вывозіцца заграніцу і гэтым часткова латаецца дзяржаўны бюджэт Польшчы. Вывозіцца лён, яйкі—прадукты працы і гадоўлі тых жа дробных „некультурных" сялян.

Цяпер пагледзім, што прывозіцца з заграніцы, на што трацяцца гэныя атрыманыя за быдла, лён, яйкі і масла, грошы?

Прывезена за той-жа сямімесячны працяг часу на 87 мільён. тлушчу—амэрыканскай саланіны ў той час, калі адсюль вывозяцца тысячы жывых сьвіней заграніцу, — на 160,879 тыс. скураў сырых і вырабленых, дарагіх аўчынкаў і рознай лякераванай і шаўровай абуткі. Далей—на 70,577 тысяч зл. шаўковай матэрыі і розных далікатных ткацкіх вырабаў, на значную суму ўвезена вінаў, касмэтыкі (пудра, духі, мыла) і галянтэрыі, і на 64 мільёны аўтамабіляў і шынаў да іх.

Як відаць, дык прывозіцца пераважна тое, чаго сялянска-работніцкія масы ніколі ня купляюць—знача грошы трацяцца на патрэбы і капрызы багачоў-капіталістаў.

Па меры таго, як яны ўкрапляюцца, абрастаюць у пёры—дзякуючы непамернаму вызыску сялян і работнікаў, з кожным годам павышаецца і прывоз гэтых, патрабляемых імі прадуктаў. Так напр. аўтамабіляў:

У 1926 годзе прывезена на 14 мільён., у 1927 г. прывезена на 37 мільён., а за 7 м. 1928 г. прывезена на 64 мільён.

І таксама стаіць справа і з футрамі, вінамі, амэрыканскай мукой, парфумамі, шоўкам і г. пад.

Прывоз увялічваецца ў той час як вываз, калі не зьмяншаецца, дык стаіць на адным роўні, бо ж сялянскія масы, пазбаўленыя ў большасьці варштатаў працы—зямлі, ня маюць магчымасьці разьвівацца, ня маюць магчымасьці на 2-х—трох дзесяцінах вясьці інтэнсыўную і рацыянальную гаспадарку.

Дзякуючы ўвозу на большыя сумы, у пераважнай частцы непатрэбных для шырокіх масаў, тавараў, Польшча кожны год мае ад'емны гандлёвы біляне—(больш купляе, як прадае) і мусіць даплачваць заграніцу, вядома-ж, золатам, ці далярамі, з агульна-дзяржаўнай касы. Да гэтага часу ўжо больш міліярда залатовак выкінута на пакрыцьце гэтага ад'емнага біляну.

А скуль-жа і ад каго бяруцца гэтыя міліярды, якія трацяцца на куплю аўтамабіляў, лякеркаў, вінаў, шоўку і г. п. прадметаў збытку?

Вядома-ж з падаткаў ад сялян і работнікаў. Праўда, бяруцца падаткі: ад абшарнікаў, купцоў, фабрыкантаў, але-ж апошнія маюць магчымасьць і перакідваць іх на тых жа працоўных: абшарнік паднімае цану на дровы, лугі, за пасьвіска сялянскага статку, купец падымае цану на тавары, фабрыкант зьмяншае плату работнікам, або так сама павышае цану тавараў і ў канцы—аднаводна грашы з іх кішэні на лучшы ў дзяржаўную касу — усе зваліцца на карку ўсіх працоўных.

Працэс мар'явіцкага архіяпіскапа Кавальскага.

У Плоцку распачаўся судовы працэс мар'явіцкага (грэцка-каталіцкага) архіяпіскапа Кавальскага, абвінавачваемага, галоўным чынам, у распусьце у адносінах да нялетніх дзяўчат і жанчын.

Большая частка справы адбываецца пры закрытых дзьвярох. На справу паклікана 99 сьведкаў, з якіх зьявілася ня ўсе. Пацярпеўшымі старанамі зьяўляюцца ўзгадаванкі мар'явіцкага манастыра, галоўным чынам нялетнія, недасьведчаныя з каторых Кавальскі карыстаўся дзеля сваіх распусных мэтаў.

Згодна з абвінавачваючым актам, справа архіяпіскапа Кавальскага заключаецца ў агульных рысах у наступным.

Яшчэ ў 1926 годзе адна з выхаванак манастыра, нейкая Асінава, (16 гадоў) нажалілася сваей матцы, што Кавальскі зрабіў яе сваей любоўніцай (вярней „наложніцай"). Бедная ўдава зьвярнулася ў гэтай справе да плоцкага старосты, але пан староста, відаць, палажыў гэту жалабу пад сукно, бо ж справа асталася бяз ніякіх пасьледзтваў. Але бедная ўдава не затрымалася на гэтым і зьвярнулася ў гэтай справе да пракурора, які і распачаў сьледзтва. Аказалася, што ахвярай архіяпіскапа Кавальскага была не адна Асінава, але і шмат іншых нялетніх дзяўчат.

Кавальскі сыстэматычна распусьнічаў нялетніх выхаванак манастыра, у чым яму памагала яго жонка і разам узгадавальніца дзяўчат „маці" Кавальская.

Каб лепш было распусьнічаць, Кавальскі выдумаў нейкую „філадэльфійскую царкаў любві" і свой „містычны шлюб". Але на гэтым ня скончыліся ласыя выдумкі „ласуна-раскошніка", ён захацеў іх абставіць урачыста і пэўне зрабіць іх аж сьвятымі, бо-ж выдумаў дзеля гэтай оргіі „12 апосталак". „Апосталак" (12!) Кавальскі выбраў з манастырскіх выхаванак і навучыў іх граць на мандаліне. Яны то ігралі яму перад сном у яго спальні, дзе за заслонай Кавальскі ў гэтым часе адбываў з якой небудзь узгаданкай „містычны брак", а наступна, пасьля гэтага „таржэства", калі „апосталкі" пакідалі граць, адна з іх аставалася на так званыя архіяп. Кавальскім „начныя адарацыі" з ім.

Натуральна, такая справа выклікала вялікае зацікаўленьне і абурэньне публічнасьці, але, нажаль, найцікавейшыя мамэнты дапросу сьведак і выкарыстоўваных Кавальскім дзяўчат, адбываюцца пры зачыненых дзьвярох, што не дае магчымасьці выявіць публічнасьці ўсю „падногатную" прапаведніка цёмным масам.

Новая ўстава.

Згодна з прэсай, ужо апрацаваны праект новай ўставы аб пэнсіях дзяржаўных урадоўцаў. Праект прадбачыць падбаўку пэнсіяў ад 15 да 25 працэнтаў.

Відаць, паны добра рупяцца аб сабе і сваіх верных служках, калі ў такі цяжкі год так шчодра раскідваюцца народнымі грашыма.

Салідарнасьць работнікаў.

Дырэкцыя варшаўскай мэталёвай фабрыкі — Голэмбёўскі выкінула беспадстаўна аднаго сьведамага работніка. Усе работнікі гэтай фабрыкі патрэбавалі прыняць яго на працу і, калі дырэкцыя катэгарычна адмовіла—абвясьцілі забастоўку, якая трывала ў працягу двух месяцаў. 15-IX інспэктар працы сазваў канфэрэнцыю і ўгаварыў уласьніка фабрыкі прыняць на працу звольненага работніка і гэтым спыніў працяжную забастоўку.

Усе за аднаго—адзін за ўсіх!

Забастоўка.

Надвоячы забаставалі работнікі, працуючыя пры будове чыгуначнай лініі Быдгошч — Гдыня. Прычына забастоўкі — невыплачаньне работніцкіх дамаганьняў падбаўкі з 75 грошаў на 90 за гадзіну працы.

Бастуе 1.200 работнікаў.

Новы польскі „król"

Да рэдакцыі „Gazety Wągrowieckiej" на гэтых днях прыйшоў нейкі Францішак Гавловіч і ўрачыста „асьвядчыўся", што ён зьяўляецца „królem polskim", адначасна запэўняючы рэдакцыю пры сьведках, што ён ня ёсьць умыслова хворы. Калі адзін з працаўнікоў рэдакцыі папрасіў яго сфатаграфаваць, дык „król" на гэта згодзіўся, толькі ўпёрся зьняць капялюш, каб ня страціць каралеўскай годнасьці. Гавловіч мае 57 гадоў, мае сына, які „будзе" заступнікам на каралеўскі трон у Польшчы.

Цікава, ці ня ёсьць такія самыя „здаровыя" на ўмыслы і нашы манархісты з-пад „Słowa".

Нарушэньне павагі сьвята ў чэсьць Тараса Шаўчэнкі.

Адна з украінскіх часопісяў*, выходзячых у Польшчы (Рада № 93) падае пад такім загалоўкам наступную вестку:

„2 верасьня г. г. у Лесьніках, Бэражанскага павету, адбылося ўрачыстае сьвята ў чэсьць Тараса Шаўчэнкі. Сьвядомае грамадзянства Лясьнікоў прылажыла ўсе стараньні, каб сьвята выпала як найурачысьцей.

Староства ў Бэражанах забараніла сьвяточны паход на чале з царкоўнай працэсіяй і забараніла пяяньне нацыянальнага гімну на канцэрце.

У суботу вечарам у Лясьнікі прыбылі 2 эскадроны польскіх уланаў, якія ў запраўднасьці мелі кватэравацца ў Патуторах. Настаў выняткові стан, раніцай пазрывана ўсе харугві, якімі былі прыбраны сялянскія хаты і вароты; у сяло прыбыло некалькі паліцыянтаў, на чале з тайным агентам, а каманда ўланаў павыстаўляла на вуліцах свае патрулі з голымі штыхамі.

Паліцыя засела ў Патуторах, Пасухове, Вульках, Лашеве і іншых вёсках і паадбірала ў ідучых на сьвята сялян штандары і паясы з надпісамі".

Далей ідзе апісаньне, як прыбывалі дэлегацыі ад сялян і ўкраінскіх арганізацыяў і як ім у часе працэсіі перашкаджалі ўланы сваімі „кракаўскімі" песьнямі, крыкамі і сьвістамі.

Калі ў канцы, працэсія спынілася на пляцы ім. праф. Галушчынскага, дзе быў вывешаны абраз Т. Шаўчэнкі, а над ім павейаў украінскі сьцяг, камандант паліцыі і тайны агент зажадалі выдачы ім сьцягу, да чаго, аднак, прысутныя не дапусьцілі, хоць і мусілі яго зьняць. Запяяў хор, а як-бы ў адповедзь яму адазваўся „роў, крыкі і сьвісты ўланаў".

Заграніцай.

У Кітаі ўсьцяж баі.

Паміж атрадамі шантунскай арміі і войскамі паўдзённага Кітаю дайшло да новых баёў. Адступаючы на поўнач, шантунскія атрады спрабавалі затрымацца на рацэ Лян. І вось тутака і дайшло да страшэнна крывавых баёў.

Змова проці манджурскага дыктатара.

З Харбіну даносяць, што мукдэнская паліцыя раскрыла змову, якая падрыхтоўвала замах на Чанг-Су-Ляна, сына Чанг-Тсо-Ліна. Паўстанцы мелі захапіць адначасна ўладу ў Мукдэне і Харбіне, дзе — перабіць усіх вышэйшых саноўнікаў манджурскага ўраду. На чале новага ўраду меў стаць ген. Чанг-Чу-Чанг, былы губэрнатар Шантунгу, які меў абвясьціць сябе дыктатарам у Харбіне. Ці гэты замах меў мэтай вызваленьне Манджуры з-пад японскага іга, якое ня мае

Аб спажывецкай каапэрацыі.

Кожны чалавек працуе дзеля таго, каб мець магчымасьць задавольніць свае жыцьцёвыя патрэбы, каб здабыць вопратку, ежу і г. д. Ня ўсякаму толькі гэта аднолькава даецца. Людзям багатым дастаецца ўсё гэта так лёгка, што справы спажыцьця іх мала цікавяць. Зусім у іншых варунках знаходзяцца людзі небагатыя, людзі працы, для якіх кожны грош мае вялізарнае значэньне, і дзеля гэтага забясьпечаньне сябе і сваей сям'і ад голаду і холаду зьяўляецца для іх справаю вельмі важнаю. Ужо даўно працоўны люд зразумеў, што жыць так, як жылося, не магчыма, што трэба знайсьці выхад з гэтага палажэньня. І вось, у 1843 годзе ў невялічкім ангельскім месьце Рочдэлі, сярод бедных ткачоў паўстала думка ўзяць справу забясьпечаньня артыкуламі першае патрэбы ў свае рукі, залажыўшы для гэтага ўласную крамку. Цяжка было на пачатку бедным ткачам дзеля варожых адносінаў суседзяў і прыватных гандляроў, але гэта іх не адстрашыла і распачатую справу яны горда і сьмела вялі ўперад, бо добра зразумелі, што толькі гэтым шляхам яны змогуць паправіць варункі свайго жыцьця. Так паўстаў першы спажывецкі каапэратыў. Хутка працоўны люд зразумеў, што толькі ўласнымі сіламі, толькі праз каапэрацыю, пабудаваную на прынцыпах рочдэльскіх ткачоў, ён зможа палепшыць сваё цяжкае жыцьцё, і вось, па прыкладу „справядлівых рочдэльскіх піянэраў" (заложанае Т-ва яны назвалі Рочдэльскім Таварыствам справядлівых піянэраў) пачалі паўставаць новыя гэтакія-ж таварыствы, з якіх і вырасла сучасная спажывецкая каапэрацыя.

Спажывецкія каапэратывы, якія даюць нам магчымасьць задавольніць свае жыцьцёвыя патрэбы ў найлепшы і найтаньшы спосаб, маюць і вялізарнае грамадзкае значэньне.

Залажыўшы спажывецкі каапэратыў можна:

1) Па справядлівай сярэдня - рынковай цане атрымаць добры тавар у добрай вазе і меры;

2) З барышоў ад грамадзкага гандлю, якія раней ішлі ў кішэнь прыватнага гандляра, складаць ашчаднасьці сябром, а, апрача таго, і адкладаць грамадзкі капітал, з якога можна выдзяляць пэўныя сумы на ўсялякія культурна-асьветныя мэты, як на закладаньне бібліятэк, чытальняў, ладжаньне лекцыяў, спэктакляў, канцэртаў і г. д.

Гэтак, як мы бачым, пры помачы каапэратыву можна задавальняць ня толькі свае патрэбнасьці ў таварах, але і наагул палепшаць варункі свайго жыцьця.

Гэта бліжэйшыя мэты каапэрацыі, мэты, гэтак кажучы, сучаснага моманту.

Але, апрача гэтага, каапэратыўны рух, які з гэтакай хуткасьцю шырыцца па ўсяму сьвету, мае і больш шырокія заданьні. Каапэрацыя імкнецца, каб праз злучаныя ў саюзы каапэратывы выціснуць зусім прыватнага гандляра і давясьці справу да таго, каб тавар даставаўся ў рукі спажыўца праз каапэратыўныя ўстановы беспасярэдня ад вытворцаў. Далей каапэрацыя імкнецца, каб каапэратыўныя цэнтралі, шляхам закладаньня ўласных фабрык і майстроўняў бралі пакрыху ў свае рукі і самы выраб тавараў. І вось, захопліваньне праз каапэрацыю вырабу тавараў, арганізацыя гэтага вырабу згодна з інтарэсамі спажыўца і раcпрадзяленьне ўласных тавараў паміж спажыўцоў і зьяўляецца канцовым грамадзка-гаспадарчым заданьнем каапэрацыі.

Кожны сябра каапэратыву, а асабліва сябры яго выканаўчых органаў, павінны ведаць і зразумець гэтыя цяжкія, але вялікія заданьні каапэрацыі. Калі яны не зразумеюць гэтых заданьняў і не распаляць свайго сэрца любоўю да каапэратыўнай думкі, дык карысьці з іх каапэратыву быць ня можа. Што гэта так, дык прыкладаў шукаць доўга ня трэба. Усе добра памятаюць, як у паваенныя часы паўставалі ў нас розныя каапэратывы, якія ня мелі нічога супольнага з праўдзівым каапэратыўным рухам, бо закладаліся галоўным чынам дзеля таго, каб атрымліваць для падзелу тыя тавары, у якіх адчуваўся тады недахоп. І вось, як толькі перастаў адчувацца гэты недахоп тавараў, дык хутка і сябры пачалі адходзіць ад гэтакіх каапэратываў і яны пазачыняліся.

Толькі тыя каапэратывы могуць існаваць і быць запраўднымі сябрамі каапэратыўнай сям'і, якія закладаюцца ня мэтаю дасягненьня якіх-колечы часовых карысьцяў, а паўстаюць у выніку абудзіўшагася ў грамадзян сьвядомага жаданьня грунтоўна палепшыць варункі жыцьця.

Толькі тыя каапэратывы маюць рацыю існаваньня, у якіх кіруючай думкай будзе асазнаная сябрамі каапэратыўная ідэя. І вось, дзеля гэтага, галоўным і неадзыўным чыньнікам разьвіцьця і існаваньня каапэратыва зьяўляецца каапэратыўнае ўзгадаваньне, ня толькі сяброў каапэратыва, а ўсяго наагул грамадзянства.

На гэтае вось каапэратыўнае ўзгадаваньне грамадзянства і павінны мы зьвярнуць асаблівую увагу. Кожны сьвядомы беларус, які верыць у ідэю каапэрацыі, павінен імкнуцца да таго, каб усё нашае грамадзянства зразумела сутнасьць і карысьці каапэрацыі і яе ролю у нашым грамадзкім жыцьці. Тагды можам сьмела сказаць, што каапэратывы, паўстаўшыя на гэтак прыгатаваным груньце, ніколі не загінуць, а будуць разьвівацца і прычыняцца да асягненьня вялікіх заданьняў каапэрацыі. А тагды, як пяюць каапэратары ў сваім гімне: „Прыйдзе доля і да нашых хат".

сілаў скінуць слабы наступнік Чанг-Тсо-Ліна, вестка не высьвятляе.

Вялікая змова проці Аммануллаха ў Афганістане

З Кабулу, сталіцы Афганістану, даносяць, што афганскі ўрад апублікаваў афіцыяльны камунікат аб арыштаваньні 64 высокіх духоўных асобаў. Арыштаваныя муллы вінаваццца ў арганізаваньні змовы, якая мела мэтай скінуць з трону Аммануллаха — у часе яго падарожжы па Эўропе. Замахоўцы ў часе адсутнасьці караля распачалі агітацыю сярод насяленьня проці ўсіх праектаваных Амманулахам рэформаў, якія маюць мэтай ператварэньне краю на эўрапэйскі лад.

Недарма-ж Амманулаха завуць „афганскім Пятром Вялікім". Бо-ж якраз такія змовы ды замахі проці цара рабіліся рэакцыйным духавенствам ды баярствам і тады.

Англія „разбраяецца"—на ўсходзе.

Англія пабудавала шэраг новых вялізарных гідраплянаў з 3 маторамі па 2.100 „конскіх сілаў" кожны. Гэтыя аэраплпны прызначаны для новай вялікай „базы паветранага флёту" Англіі ў Басоры. Басора, гэта—порт у Пэрсідзкім заліве на Захадзе Індыі, які пануе і над далінай Мэсапатаміі. Гэтыя гідрапляны, поруч з марскім флётам Англіі — маюць задачай гарантаваць панаваньне Англіі на яе Індыйскім Усходзе, асабліва-ж пільнуючы англійск. марскіх шляхоў з Эўропы ў Індыю.

Як ведама, Англія мае з усходняга боку Індыі другую такую-ж, яшчэ большую „базу", якая пільнуе англійскага панаваньня на далёкім усходзе (Сінгапур).

Проці-польская дэманстрацыя ў Харкаве.

„Кур. Варш." даведаўся з Масквы, што ў часе проці-англійскіх дэманстрацыяў у Харкаве адбыўся мітынг, на якім аратары пратэставалі проці апошніх заяваў Валынскага ваяводы Юзэфскага — аб аддзяленьні Радавай Украіны ад СССР. Мітынг закончыўся крыкамі абурэньня проці „імпэрыялістычнай Польшчы".

Радавыя работнікі памагаюць бастуючым ткачам у Лодзі.

„Кур. Варш." даведаўся з Масквы, быццам выканаўчы камітэт прафэс. саюзу ткачоў асыгнаваў 85.000 руб. на дапамогу бастуючым работнікам тканінных фабрыкаў у Лодзі.

Проці-польскія заявы „віцэ-Вальдэмараса"

Літоўскі міністар скарбу Тубяліс, які заступае прэм'ера—у часе адсутнасьці Вальдэмараса, заявіў прадстаўнікам прэсы, што новы літоўскі мытны тарыф скіраваны толькі проці польскіх тавараў, якія ідуць у Літву пад маркамі іншых дзяржаваў. Новы тарыф ня мае тасавацца ўрадам—ані да нямецкіх тавараў, бо з Нямеччынай Літва зьвязана гандлёвым трактатам, — ані да радавых тавараў, бо з радавым урадам намысна ідуць перагаворы аб заключэньні трактату. Што датычыць польска-літоўскіх перагавораў, дык цяпер ня можна нічога сказаць: усё залежыць ад рэзультатаў канфэрэнцыі, якая мае адбыцца ў Кэнігсбэргу.

Польска-радавыя гандлёвыя стасункі.

Радавае агенства даносіць аб канфэрэнцыях прадстаўнікоў дэлегацыі польскіх прамыслоўцаў у Ленінградзе з сябрамі Заходняй Гандлёвай Палаты—у справе арганізацыі больш цесных стасункаў гандлёвых паміж абодвума краямі. Польская дэлегацыя запрасіла Зах. Гандлёв. Палату СССР да ўчасьця ў агульна-польскай выстаўцы ў Пазнані.

Рэзультаты выбараў у Швэцыі.

У Швэцыі толькі-што адбыліся выбары ў „верхнюю палату" парляманту (як Сэнат у Польшчы). Выбары далі такі склад новай „другой палаты": кансэрватары атрымалі 73 мандаты, сацыял-дэмакраты—90, лібэралы — 32, аграрыі (земляўласьнікі) — 27, і камуністы — 8 мандатаў. Выбары далі нязначную большасьць буржуазнаму блёку, раўнуючы да блёку сацыялістычна-камуністычнага.

Становішча Амэрыкі ў справе англа-францускага марскога паразуменьня.

Нямецкая прэса даведалася з Нью-Ёрку, быццам прэзыдэнт Куліджж мае зараз-жа пасьля свайго павароту ў Вашынгтон выслаць англійскаму і францускаму ўрадам вельмі энэргічную ноту, у якой амэрыканскі ўрад заявіць, што Амэрыка змушана—з прычыны тайных марскіх трактатаў паміж Англіяй і Францыяй—прыняць наступныя меры дзеля абароны сваіх інтарэсаў на моры. 1. Далейшае выкананьне вялікай марской праграмы збраеньняў, прадбачучы ў першую чаргу будову 23 крэйсэраў па 10.000 тонаў кожны; 2. Устрыманьне свайго ўчасьця ў далейшых працах камісіі, падрыхтоўваючай скліканьне міжнароднай канфэрэнцыі ў справе разбраеньня. Апрача таго, Амэрыка будзе дамагацца ад Англіі і Францыі перагляду ўмовы ў справе агульнага танажу крэйсэраў, уставіўшы яго на 300.000 тоннаў.

Узнаўленьне вайны ў францускім Марокко.

З Рабату даносяць, што азброеныя атрады мясцовых жыхароў у францускім Марокко ізноў распачалі паўстаньне і ваенную акцыю. Каля Арбаны дайшло да паважных сутычак паміж сільнымі атрадамі паўстанцаў і францускім войскам. Шмат раненых у баі з абедзьвюх бакоў. Францускі самалёт—у кару за паўстаньне—кідаў бомбы на лягер рыффэнаў пад Ізэр-Туруг, адкуль, як сьцьверджана, йшла дастаўка аружжа суседнім плямёнам. Бамбардыроўка з аэрапляну забіла шмат людзей.

Забастоўка партовых работнікаў ува Францыі.

У порце Бордо на сабраньні партовых і докавых работнікаў прынята пастанова абвясьціць агульную забастоўку. Забастоўка мае эканамічны грунт: работнікі дамагаюцца значнай падвышкі платаў.

Барацьба з бастуючымі партовымі работнікамі ў Аўстраліі.

Уласьнікі параходных ліняў усьцяж вядуць упорную барацьбу з бастуючымі работнікамі, не жадаючы спаўняць іх дамаганьня. На мейсцы бастуючых яны знайшлі шмат іншых работнікаў, якія не запісаліся ў праф. саюзы. Улады адміністрацыйныя і судовыя яўна сталі на бок працадаўцаў. Шмат бастуючых работнікаў арыштавана — „за выкліканьне забурэньняў" — пэўне-ж, у зьвязку з акцыяй штрэйкбрэхэраў. Прафэсыянальны Саюз партавікоў у Мэльбурне аштрафаваны судом на 1.000 фунтаў — за „пад'юджваньне да забастоўкі".

На страх ворагам.

Янка Станкевіч, з яго „дзівосамі і сьмяхотамі" так абрыдзеў, што проста ня хочацца адказваць на іх. Тым часам, ня гледзячы... на паведамленьне ўсяе польскае прэсы аб спыненьні „Сялянскае Нівы", вестку аб чым падала і наша газэта, паказаўся ў сьвет, на страх ворагам, новы 36 нумар яе, які, заместа таго, каб запраўды паважна разьбіраць справу, ці то вясьці ідэалёгічную палеміку,—мала адыйшоў ад Янкі з яго „дзівосамі".

У перадавіцы яна, аказваецца, выстаўляецца насьледніцай „Нашай Долі" з 1906 г., першай рэвалюцыйнай беларускай газэты, якая за сваю рэвалюцыйнасьць з 6 нумароў—пяць раз была канфіскавана і на шостым спынілася. Лічыцца насьледніцай гэтай газэты „Сялянскай Ніве" — гэта проста, мягка кажучы, фальшаваньне рэвалюцыйнай думкі. Газэта, хвалячая румынскага манархіста Маніў, і рэвалюцыйнасьць — гэта ўжо зашмат!

Ды ўрэшце „С. Н." і не дабачае рэвалюцыйнага мамэнту ў „Нашай Долі", яна бачыць у ей толькі беларускую газэту. Слова „рэвалюцыйная" — хіба баіцца каламутная „Ніва", бо, пераходзячы да ацэнкі іншых газэт, яна ўсюды мае адзіны крытэрый (мерку)—беларускасьць, думаючы на гэтым адыграцца. Гаворачы аб „Б. Дні", „Грамадзяніне", „Народзе"—„С. Н." запраўды такі дэлікатна, вельмі далікатна кажа, што яны „з кірункам на Заход." Усім ім пасьвечана толькі некалькі радкоў.

Затое ўрэзала на ўсю руку „С. Ніва", перайшоўшы да „Рэха Працы". Тут яна ўжо дала волю пяру і пачала валіць, як сякерай (можа ў надзеі на чыюсь пахвалу?!).

Толькі паслухаць „С. Н." — дык выходзіць, што „Рэха Працы" „пастанавіла сваей мэтай бараніць інтарэсы мясцовага насяленьня, а перадусім работнікаў, бяз розьніцы нацыянальнасьці, г. знача работнікаў польскіх, жыдоўскіх, расейскіх, ну, і беларускіх" (значыць, апошніх пры канцы!). Далей нібы — „Р. П." уважае, што самі беларусы не здалеюць уласнымі сіламі здабыць сабе лепшае долі і затым галоўным чынам (падч. Рэд.) разьлічвае на чужацкую помач, польскіх ці то расейскіх работнікаў"...

Можна было-б падумаць, што ў перадавіка „С. Н." замяшаньне ў галаве пасьля доўгага беспрацоўя, бо такое сьвядомае ілжы мы ня бачылі дасюль навет ад сельсаюзьніцкага органу. Але тут на ілжы далёка не заедзеш. Так, мы баронім пралетарыят, але перадусім беларускі, не пакідаючы і пралетарыяту іншых нацыянальнасьцяў, як свайго натуральнага саюзьніка.

Але мы сьведамы вялікай ролі ў працоўным руху таксама сялянства, маем на ўвазе заўсёды інтарэсы беларускага селяніна і стала цьвердзім, што толькі ў саюзе сялян і работнікаў, у супольнасьці іх інтарэсаў, у супольнасьці барацьбы за агульныя правы працоўных—адзіны шлях перамогі!

А што тычыцца выказанай нібы намі нявеefы ў свае сілы, то проста дзіва, як перадавік „С. Н." пускае міма вушэй нашае стале цьверджаньне, што мы мусім спадзявацца ў першую чаргу на свае ўласныя сілы, сьвядомасьць і арганізаванасьць.

Гэта добра ўсьведаміў сабе кожны, хто чытае нашу газэту, толькі, як відаць, перадавіку „С. Н." ня тоўпіцца гэта ніяк у галаву, які, напісаўшы яўна і сьвядома фальшывае цьверджаньне, пашоў далей, асноўваючыся на ім і, пішучы розную блытаніну на тэму аб значэньні пралетарыяту (гэтага слова, між іншым, таксама высьцерагаецца ўжываць баязьлівая „Сял. Ніва") і сялянства ды, ўрэшце, проста б'е сама сабе. Яна кажа, што „нельга спадзявацца на ўсьведамленьне і арганізацыю работнікаў і чужацкую дапамогу—трэба ўсьведамляць і арганізаваць агрмадную большасьць гэтага народу — беларускія сялянскія сярмяжныя масы". Пане перадавіку „С. Н."! — дзе-ж Вашыя арганізаваныя сяляне і чым Вы іх усьведамляеце? Тым, што „пастанавілі мэтай... арганізацыю яго ў моцную партыю"?

Гэта Ваш „Сялянскі Саюз"!?

А ці ня Ваша гэта газэта проці партыі, якая злучала чуць ня ўсё беларускае сялянства, гэтак варожа выступала? Не саромце сябе, бо вы так залгаліся, што Вам ніхто проста не паверыць, ня толькі сяляне, якія Вас адарылі... поўнаю зьнявагай. Не памогуць навет Вашы напускныя сьлёзы!

Адно праўда, што „С. Н." ня так вырашае зямельнае пытаньне, як „Рэха Працы". На жаль Вы, відаць, ня ведаеце нашага вырашэньня, бо каб сказалі, то так напэўна сказалі-б, як сказалі аб пралетарыяту і сялянстве наагул. Трафарэт Ваш аб уласнасьці і іншых роскашах для сялян ведаем, але ня ведаем, ня бачылі вашай барацьбы навет за ўласнасьць. Ня чулі вашага адношаньня да прымусовай камасацыі, парцэляцыі з выкупам, да ліквідацыі сэрвітутаў, якія разыгрываюцца на нашых вачох.

Значыць, Вашы ўсе словы—гэта завеса для баламучаньня сялянства, і пазвольце Вам ня толькі не паверыць, што „і ўсе іншыя пытаньні... вырашаеце згодна з інтарэсамі і ідэаламі беларускага сялянства" — але проста бачыць у іх... пустыя фразы.

Сялянства ня плакала на вашай мнімай, як аказалася, сьмерці, не заплача і аб запраўднай. Паказаліся на страх ворагам, але запраўды лепш—злазьце з даху і ня псуйце гонтаў! Або ўрэшце навучыцеся-ж Вы пісаць без брахні!

Наша хроніка,

КАСТУСЬ СМАКІЛА
памёр 8-га верасьня г. г.

8-га верасьня г. г. памёр ведамы з працэсу Грамады Кастусь Смакіла. Ня гледзячы на тое, што ён быў 100 прац. інвалід і так моцна падупаўшы на здароўі, суд засудзіў яго на некалькі гадоў. Праз кароткі час сядзеньня турэмная адміністрацыя даведалася, што яго ня ўтрымаць ня толькі што ў турме, але і на сьвеце, бо меў ён сухоты. Такім чынам яго выпусьцілі, каб памёр на „волі".

Сьмерць гэтай ахвяры агарнула сумам, ня толькі вёску, дзе ён жыў і памёр, але і ваколіцу. Кожны сьпяшыў на пахараны, каб аддаць апошні доўг. Рукамі сялян і сялянак былі сплецены з дамарослых красак вялікі вянок. Дарогу, па якой нясьлі хаваць нябожчыка, хлопчыкі пасыпалі сечанымі яловымі лапкамі, а дзяўчаты—краскамі.

Паслы на вёсцы. Пасьля перарыву, выкліканага, як абставінамі вонкавага характару, гэтак і прычынамі разыходжаньня ўнутры беларускага грамадзянства, паслы Сялянска-Работніцкага Клюбу выехалі на вёску, каб паінфармаваць выбаршчыкаў аб сваей працы пры дапамове мітынгаў. Намечана было зрабіць цэлы рад мітынгаў, спачатку пераважна ў тых мясцовасьцях, скуль паслы былі выбраны.

У чацьвер, 13 верасьня меўся адбыцца мітынг у Навагрудку, куды паехалі паслы Я. Гаўрылік і Ф. Валынец, наступна ў чацьвер, 19 верасьня — ў Глыбокім (Я. Гаўрылік і Ф. Валынец) і ў пятніцу 20 верасьня — ў м. Куранцы, Вялейскага пав. (Ф. Валынец і І. Дворчанін). Былі пасланы паведамленьні суадказным старостам і потым на месца паехалі і самі паслы.

Аднак, ані аднаго мітынку так і не ўдалося зрабіць. Мясцовыя ўлады гэтага не дазваляюць. Пакуль не падаём падробнасьцяў перагавораў і „фармальных прычынаў" недазволу, канстатуем, аднак, факт, што паслом Сялянска-Работніцкага Клюбу не магчыма сказаць праўду выбаршчыкам. Затое гэтую магчымасьць маюць хадэцкія і сельсаюзьніцкія паслы ды Спадар. Іх, відаць, выпускаюць, каб адыграліся. Па-за гэтым поўны прастор для знамянітых бэбэхаў.

Спэктакль-вечарына беларускіх студэнтаў у Вільні. 22 верасьня г. г. Белар. Студэнцкі Саюз У. С. Б. у Вільні наладзіў спэктакль-вечарыну ў салі Віленскай Беларускай Гімназіі.

Праграма вечару складалася: 1) з п'есы „Сурдут і сярмяга" Ул. Гутоўскага, дэклямацыяў, хору пад кіраўніцтвам вядомага на беларускай культурнай ніве гр. Г. Шырмы і скокаў.

Ня гледзячы на некаторыя заганы, як напрыклад: неадпаведныя вопратка і дэкарацыя вясковай хаты, спэктакль пакінуў на прысутных добрае ўражаньне, на што, бязумоўна, палажылі стараньні больш сьвядомыя і руплівыя сябры саюзу. Вітаючы гэты крок будучых будаўнічых нашага жыцьця, трэба з сумам сцьвярдзіць, што шмат глядзельнікам перашкодзілі прыйсьці на вечар чуткі, быццам пад уплывам аднэй пані (нібы яшчэ і былай грамадоўкі), вечар меўся быць наладжаны толькі для „парадачных і чыстых" грамадзян, дзеля чаго меліся вызначыць уваходную плату ня менш 3 зл. Відаць, што пад націскам дэмакратычных сяброў з пасярод студэнтаў, гэтага зрабіць не ўдалося.

Сымптоматычным зьявішчам для „нашых часоў" ёсьць і выбар п'есы, дзе пры заслоне сярмяга падае сурдуту руку для згоднага жыцьця (?).

Першы раз на беларускім вечары быў прысутным начальнік публічнага бесьпячэнства, пан Кіртыкліс, і ўсе „казённыя" беларусы.

„Адвесілі", але ня ўсё. Чытачы нашай газэты ведаюць аб „адвешаньні" Галоўнай Управы. Але аб адным факце невядома.

Поруч з Галоўнай Управай таксама „завесілі" і запячаталі Гурток Т-ва Белар. Школы на Новым Сьвеце ў Вільні, які мае сябрамі выключна мясцовых работнікаў. Яго так і не „адвесілі" аж да гэтага часу. Ці можа забылася дэлегацыя аб ім успомніць? Трэбуем высьвятленьняў ад адказных чыньнікаў.

Канфіската „Маланкі". У чацьвер, 20-га верасьня паліцыя сканфіскавала № 9 часоп. „Маланка" за фэльетон Я. М. „Усемагутны паліцыянт", а таксама за верш Улад-Ініцкага, за жарт і дзьве карыкатуры.

Характэрна, што паліцыя забрала, апрача канфіскаваных, усе іншыя клішэ, якія ня былі канфіскаваны, чым навяла рэдакцыю на вялікія матэрыяльныя страты і тым самым устрымала выхад наступнага нумару на некалькі дзён.

Варта адзначыць, што згодна 73 арт. „Новага Права Прасовага", улады павінны найпазьней у працягу 24 гадз. пасьля выданьня загаду канфіскаты паведаміць аб гэтым адказнага рэдактара, што, аднак, да гэтай пары ня было зроблена. Рэдактару „Маланкі" прыйшлося марнаваць час і абіваць парогі Старосты Гродзкага і Суда, каб даведацца аб прычынах канфіскаты „Маланкі".

Заместа гімназіі—паўшэхная школа. Як ужо паведамлялася ў папярэдніх нумарох нашае газэты, па загаду Маладэчанскага Старосты зараз-жа пасьля малебну зачынена Радашкоўская Беларуская Гімназія, быццам „за нізкі пазём".

Калі бацькаўскі камітэт зьвярнуўся да адпаведных уладаў з пратэстам, дык абяцалі адчыніць, але паўшэхную школу.

Вось панкі Станкевічы са сваей кумпаніяй нешта ў сваім „воргане" пра гэта маўчаць. Відаць, прыказана.

Ну, а мы яшчэ раз думаем спытацца ў іх, што-ж будзе далей, да чаго давядзе ваш флірт? Ці можа ў сьлед за каапэрацыяй перадасьцё „пад апеку" і беларускае школьніцтва? Да гэтага вы вядзеце справу, але-ж забываецеся, што яшчэ ёсьць беларускі працоўны народ, які скажа сваё апошняе слова і назавець вас не інтэрнацыянальнымі жулікамі, а проста прадажнікамі. Гэта будзе лагадней, але мацней і праўдзівей.

Зачынілі і расейскую гімназію. Як інфармуе прэса, надовячы зачынена расейская гімназія ў Вялейцы. Прычыны зачыненьня паданы, быццам сцьверджаны брак адпаведных кваліфікацыяў сярод вучыцельскага пэрсаналу і нізкі зровень вучняў выменёнай гімназіі.

А мо' й тут завялося што антыдзяржаўнае, мо' камунізм,—хто-ж яго ведае...

Перад гэтым зачынілася таксама расейская гімназія ў Пінску. Бацькаўскі камітэт выменёнай гімназіі перад закрыццём яе зьвярнуўся да Т-ва Бел. Школы з просьбай аб ператварэньні яе ў беларускую і аб выхлапатаньні канцэсіі. Ад імя Т-ва Бел. Шк. езьдзіў для распазнаньня справы на месцы пасол І. Дварчанін, дзе ў паразуменьні з бацькаўскім камітэтам і пэдагогічным пэрсаналем гімназіі разам вырашылі справу ператварэньня ў дадатнім сэньсе. Аставалася толькі выхрабіць канцэсію. У часе гэтых перагавораў, аднак, здарыўся вядомы факт з „завешаньнем" Галоўнай Управы Т. Б. Шк. і такім чынам ад новай гімназіі прыйшлося адмовіцца.

Цікава адзначыць факт, што ўсьлед за паслом Дварчанінам паехаў да Пінску Я. Станкевіч, ня ведаючы, здавалася-б, аб апошнім рашэньні працаўнікоў Т. Б. Ш., і таксама гутарыў аб адчыненьні гімназіі. Ці ня ёсьць гэты факт лішнім доказам зьвязку „патаемных" сілаў беларускага грамадзянства з спадаром? Вельмі цікава.

Суд над Цэнтральным Камітэтам КПЗБ. 22 верасьня г. году ў Акружным Судзе ў Вільні распачаўся цікавы працэс Цэнтральн. Каміт. Кам. Парт. Зах. Беларусі.

Падсудных 10 чалавек, на чале з інжынерам тэхналёгіі Пятром Цьвятковым, прыбыўшым у Вільню з Прагі (чэскай), дзе атрымаў вышэйшую навуку і Шварцам, быццам сэкрэтаром Акр. Камітэту Кампартыі Зах. Беларусі. Падсудныя абвінавачваюцца ня толькі ў прыналежнасьці да Ц. К. КПЗБ, але і арганізаваньні камсамолу.

На сьведкаў паклікана 19 чалавек, з якіх віленская прэса адзначае камісараў паліцыі—Навакоўскага і Унгхоера і пасла з Беларускага Сялянска-Работніцкага пас. Клюбу д-ра Дварчаніна, які складаў свае паказаньні пабеларуску.

Абвінавачвае пракурор Калапскі, вядомы беларускаму грамадзянству з працэсу „Грамады", які быў галоўным абвінавачваючым.

Бароняць адвакаты: Андрэеў, Дурач, Чэрніхаў, Тэсфос, Пятрусэвіч і Дамброўскі.

Падсудныя прыведзены з вастрогу. Суд адбываецца пры закрытых дзьвярах, дзеля чаго аб самым працэсе мала чаго можам падаць. Віленская польская прэса піша, што першы дзень працэсу пачаўся гарачым пратэстам падсудных проці накладаньня ім кайданаў пры перавозцы ў суд. Гэты загад камэнданта канвою прызнае „зусім лішнім" навет абшарніцкае „Слово" ў 220 нумары, „з прычыны чаго падсудныя і не хацелі iсьці ў суд, але іх завялі сілай".

Цікава, што аб гэтым факце кожная польская газэта піша зусім інакш і ня так далёка аб'ектыўна, як навет буйна-абшарніцкае „Слово". Напрыклад „Кур. Віл." у № 218 піша:

„Даведваемся, што падсудныя ў часе

зыводжаньня іх з каморкаў зрабілі дэманстрацыю, выклікаючым захаваньнем і апорам паліцыі, якую „корaлі“ (білі нагамі) і білі рукамі). Дык паліцыя была змушана налажыць ім кайданы“

„Вязьні падвялі яшчэ большую авантуру, але ў рэзультаце іх „заладавалі“ ў аўтамабіль і так завязьлі ў Суд“. Але і ў судзе „авантурнікі“ ня лічылі яшчэ за прагранае— ляглі на зямлі і „ані руш“—не хацелі йсьці ў суд, куды іх ўвялі толькі сілай“.

Рэхам такога абходжаньня (накладаньня кайданаў), піша „Słowo“, было далейшае пратэстацыйнае захаваньне падсудных і на судовай салі, асабліва Гэлера, Додзюка і Шварца, за што Шварц навет быў выведзены з суду, але на кароткай паўзе ізноў уведзены. (Шварц ужо быў караны судом на 4 гады цяжкага вастрогу за ўчасьце ў турэмных дэманстрацыях).

Першы дзень працэсу (ў суботу) працягнуўся да 5 гадзіны вечара.

Адбылося спраўджаньне падсудных і сьведкаў і складаньне выясьненьняў.

У другім дні працэсу выслухана некалькі сьведкаў, пачым прыступілі да адчытываньня дакумантаў, быццам сьцьвярджаючых віну падсудных. На чытаньне гэтых дакумантаў пашоў блізка цэлы дзень.

У трэцім дні выслухваліся рэчазнаўцы: капт. Моселевіч, ў справе шыфраў і каліграф Качор, і адбывалася далейшае адчытваньне актаў.

Прыгавар будзе вынесяны ў хуткім часе, які і падамо ў наступным нумары.

Уцяклі з вастрогу. Надовячы з Лукішкаў перявязьлі пад моцным канвоем у Глыбокае Валашэвіча, Сінеўскага і Мажэя, якія былі абвінавачаны ў прыналежнасьці да Ц. К. К. П. З. Б. і ў шпікоўстве на карысьць Радаў.

Па прыбыцьці ў Глыбокае іх памясьцілі там ў вастрозе, а за пару дзён меўся адбыцца суд. Калі прыйшоў дзень суда (21 г. м.), аказалася, што папярэдняй ночы камуністы выламалі краты і ўцяклі ў кірунку радавай граніцы. Паліцыя наладзіла пагоню, якая ня дала ніякага рэзультату.

Гэтая ўцечка выклікала ў Глыбокім цэлую сэнсацыю.

Так гэтую вестку падае 217 нумар „Кур. Віл.“.

Камуністычная справа. Выезднoй сэсіяй Акружнага Суда ў Вільні разглядалася ў Вялейцы справа 8 камуністаў, абвінавачваных у дастаўцы з Менску агітацыйнай літэратуры дзеля распаўсюджваньня яе на „Крэсах“.

Суд засудзіў П. Данкевіча на 6 гадоў турмы, М. Даніча на 5 гадоў, І. Мордуса на 4 гады, Пальчэўскага і Н. Даніча на 2 гады турмы кожнага. 3-х апраўдана.

Старaста-арганізатар. Як падае 216 № „Слова“, апошнімі днямі ў вёсцы Столінцы, у раёне Рубяжэвічаў польскія ўлады арыштавалі вясковага старасту (солтыса), а разам з ім яшчэ 6 камуністаў, якія быццам былі з'арганізаваны старастаю ў ячэйку. У ліку арыштаваных, быў і звольнены з арышту нейкі Аляксей Бэнэровіч, за выкрыцьцё гэтай „шпікоўскай“ арганізацыі. Праз некалькі дзён Бэнэровіч быў няведама кім забіты і ўкінуты ў возера. Труп яго злавілі рыбакі. Падазраюць, што забойства—справа неарыштаваных сяброў ячэйкі.

Прапаганда каталіцызму. Як інфармуе „За Свабоду!“, у-ва ўсіх паветах віленскай каталіцкай мітраполіі арганізоўваюцца інструктарска-грамадзкія „зьезды-курсы“, маючыя на мэце падгатоўку кадраў сьвецкіх прапагандзістаў ідэяў каталіцызму ў вёсках. Маюцца на воку арганізацыі моладзі, пашырэньне грамадзкай працы ў духу каталіцызму і выбар практычных мэтадаў гэтага пляну,—пастаўлена і пытаньне аб фінансавым падтрыманьні гэтай акцыі.

Адным словам, нешта падобна на крыжавы паход на „Крэсы“.

Катастрофа пад Ваўкавыскам. 21 г. м. паміж станцыямі Зэльва—Ваўкавыск мяшаны цягнік наехаў на работніцкі вазок. 5 работнікаў забіта, 1 цяжка ранены.

На месца выпадку выехала камісія.

З Т-ва Бел. Школы.

Абвестка.

Да ўсіх гурткоў Таварыства Беларускай Школы Косаўскага павету.

Гэтым паведамляецца, што Косаўская Акружная Управа Т-ва Беларускай Школы перанесена з вул. Марачоўскай № 21 на вуліцу Касьцюшкі № 10 у Косаве, куды і просім зварачвацца за справамі. Управа.

Зьмяшчаючы ў радзе нумароў нашай газэты асобным аддзелам хронікі „З жыцьця Горадні — ня можам ня выказаць пажаданьня, каб і другія нашы буйныя цэнтры, як Беласток, Баранавічы і інш., мелі таксама свае асобныя аддзелы, бо такім чынам мы будзем мець больш ведамасьцяў з сьвядомага пралетарскага жыцьця. Падаем гэта да ўвагі нашым карэспандэнтам.

Нам пішуць:

✕ Селяніну з вёскі Косіч, Вайстамскай вол., Вялейскага пав. трэба было, каб войт пасьведчыў паштовы пераказ на 200 зл. П'яны войт зажадаў за гэта 2 зл., а калі селянін пачаў прасіцца, каб зьменьшыць гэтую плату, бо ня меў столькі грошай, дык войт пачаў страшыць пратаколамі.

Душаць нашага брата рознымі пратаколамі.

✕ У Браслаўі 8-га верасьня г. г. пасол Юхневіч зрабіў „сельсаюзьніцкі мітынг“. Браслаўскія сяляне ўжо ведаюць гэтых „ваўкоў і авечай скуры“, але ўсё-ж такі цікавалі: што ён будзе чаўпсьці? Але „прамоўца“ буркнуў пару слоў ды ўжо хацеў канчаць, бо пабачыў, што перад ім стаіць, разьвесіўшы вушы... толькі адна паліцыя: сяляне спакойна пакінулі „мітынг“. Ня дарма гаворыцца, што „абманам увесь сьвет пройдзеш, але назад ня вернешся“—таксама і сельсаюзьнікі зрабілі. Браслаўскія сяляне ведаюць, што праўдзівыя абаронцы працоўных мас гэта паслы з Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу і верачь, што яны калісь такі зьявяцца да нас у Браслаў і зробяць праўдзівы, масавы мітынг.

✕ **У в. Мордзічы, Баранавіцкага павету** з 1 на 2-га верасьня г. г., у сувязі з сьвятам „Мюду“, быў вывешаны чырвоны штандар з антыпанствовымі лёзунгамі.

✕ **У в. Мордзічы, Баранавіцкага павету** 11-га верасьня г. г. чуць сьвет прыехалі 3-х паліцыянтаў, якія, зрабіўшы вобыскі ў сялян Р. Гурскага, Я. Яфімовіча і Я. Кунцэвіча і нічога не знайшоўшы, забралі памянёных сялян і адправілі ў пастарунак. На пастарунку пачалося ўсім вядомае „бадане“. Жыхары жалезьніцы расказываюць, што чулі енкі і крыкі катаваных. Пасьля гэтага арыштаваных перавязьлі ў баранавіцкую дэфэнзыву, якая вельмі добра вядомая ваколічным сялянам сваімі сярэднявечнымі пыткамі.

Два-тры дні пачакаўшы, сваякі арыштаваных езьдзілі іх пабачыць і завязьці крыху ежы. Аднак, пабачаньня не дазволілі. Выпадкова давялося толькі ўбачыць Кунцэвіча, якога ледзь спазналі, бо твар увесь быў спухшы і чорны.

Усе гэтыя выпадкі надта абурылі мясцовае грамадзянства. Кожын жыхар в. Мордзіч ведае арыштаваных, як элемэнтаў апалітычных.

Ходзяць чуткі, што гэта быццам праца жыда Н. Клецкіна, які на груньце асабістых непаразуменьняў нахлусіў на арыштаваных сялян, што нібы яны камуністы і працавалі ў ноч з 1-га на 2-га верасьня. **Зорка.**

Ад рэдакцыі. Гэтая справа перадана ў Беларускі-Сялянска-Работніцкі Клюб.

Паштовая скрынка.

Чураёўцу. З Вашых двух карэспандэнцыяў ня можам скарыстаць, бо змаглі прачытаць толькі загалоўкі. Калі хочаце, каб тыя справы, аб якіх пішаце, пайшлі ў Бел. Сял.-Раб. Пасольскі Клюб ды каб надрукаваць аб іх у газэце, напішыце яшчэ раз, але коратка і ясна ды больш разборчыва, каб магчыма было прачытаць і зразумець, у чым справа, тагды скарыстаем.—**Эду.** Пісьмо ня зьмесьцім бяз прозьвішча і адрасу, што патрэбна для ведама рэдакцыі. — **Авр. Упр. Т-ва Бел. Школы ў Сьвіслачы.** Справаздача з зьезду ў Сьвіслачы друкавалася ў № 6 „Долі Працы“, за што быў сканфіскаваны гэты нумар. Адозва надрукавана ў № 8 „Долі Працы“. У справе неатрыманьня газэт дамагайцеся на пошце. З прысланага скарыстаем.—**Ното.** Вашыя карэспандэнцыі нельга расчытаць — пішыце выразьней.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Ці падалі Вы ужо дэклярацыі на беларускую школу? Як ідзе у Вас справа дэклярацыяу? Пішэце у газэту і канцэлярыю Гал. Управы Т-ва Беларускае Школы.

Справа „прыкарпацкіх русінау“ (украінцау).

Чэха-славацкая палітыка ў справе меншасьцяў, кіраваная такім мастаком, як Бэнэш,—пад маральным уплывам такога гуманіста, як прэзыд. Масарык, адразу вырабіла сабе добрую марку „шчырай і разумнай“.

Ня так даўно прэзыдэнт Масарык заявіў у гутарцы з нямецкімі журналістамі, што немцы, якія—ў лічбе 3 мільёнаў — жывуць у Чэха-Славакіі, зусім ня могуць ужо лічыцца „нацыянальнай меншасьцяй“.—„Яны зьяўляюцца цяпер ужо арганічнай, складовай часткай народу рэспублікі“, захоўваючы цалком сваю культурна-нацыянальную аўтаномію... Запраўды-ж у працягу апошніх гадоў—пасьля зацятай, але стрымана-культурнай барацьбы-канкурэнцыі з сваімі былымі заклятымі валадырамі-ворагамі—Чэхі здолелі спакойна і рэчова паразумецца з немцамі. І цяпер у склад чэха-славацкага ўраду ўваходзяць 2 немцы, займаючы найбольш важныя і адказныя становішчы міністраў.

Так-сама і ў стасунках з славакамі. — Пасьля вострай барацьбы прамысловай Чэхіі з сялянскай, сельска-гаспадарчай Славакіяй, над якой чэхі, лічучы сябе „вышэйшым народам“, хацелі панаваць, розум дзяржаўны і здабытая ў нямецкай школе стрыманасьць хутка дарадзілі чэшскім дзяржаўнікам пайсьці на кампраміс і ў гэтым напрамку. І вось, у рэзультаце паразуменьня з славакамі (праўда, рэпрэзэнтаванымі сялянска клерыкальнымі групамі) — наладзіўся „нацыянальны мір“ і гэтым стык у дзьвюх складовых частак новазбудаванай дзяржавы. 2 славацкіх міністры ў пражскім урадзе „рэпрэзэнтуюць Славакію, пільнуючы (так-сяк) інтарэсы славацкага сялянства“.

Можа ўсе гэта не выстарчае, але ўсе прынцыповыя крокі ў напрамку ўнутранага міру і кансалідацыі новай дзяржавы зроблены.

Якую вялізарную вагу такая разумная ўнутраная палітыка мае для вонкавай сілы, аўтарытэту і міжнародных пасьпехаў дзяржавы, Чэха-Славакія магла пераканацца ў вельмі хуткім часе.

Краёвыя і замежныя немцы адкрыта і шчыра пагадзіліся з існаваньнем і граніцамі новай дзяржавы, адмовіўшыся ад усялякай агітацыі проці Чэха-Славакіі, а—наадварот— памагаюць ёй, як унутры яе, таксама і на міжнародавым груньце. — Калі-ж вэнгерскія нацыяналісты — ў паразуменьні з ведамым англійскім „прэсавым каралём“, лёрдам Ротэрмэрам—распачалі кампанію—аб такім пераглядзе вэнгерскіх граніцаў, які меў ізноў далучыць да Вэнгрыі „адарваных з крывей ад матчынага лона славакаў“, дык увесь славацкі сялянскі народ аднагалосна з абурэньнем заявіў, што — „Славаччына ўся, як адзін чалавек, паўстане проці ўсялякай спробы аддаць яе ўзноў над ненавіснае ярмо мадзьдзярскіх магнатаў-абшарнікаў“...

З гэтага відаць, што Чэха-Славакія якбыццам вырашыла цалком — за 10 гадоў дзяржаўнага існаваньня-задачу кансалідацыі сваей дзяржаўнасьці, зьліквідаваўшы ў сябе амаль не цалком „справу нацыянальных меншасьцяў“. У апошні час цалком нарыхтавана справа канчальнага ўвядзеньня аўтаноміі для амаль ня ўсіх складовых частак Чэха-Славакіі—з уласнымі краёвымі Соймамі. Але, нажаль, гэта—ня зусім так. — Незажываючай ранай на целе дый нязмытай яшчэ плямай на гонары маладой дзяржавы астаецца ўсьцяж справа „прыкарпацкіх русінаў“.

Геаграфічнае і палітычнае палажэньне гэтай „Прыкарпацкай Русі“, якая этнаграфічна прадстаўляе адзінае цэлае з украінскім масывам Усходняй Галіччыны, — у найвышэйшай меры асабліва. Як ведама, украінцам, як і беларусам, не ўдалося, ня гледзячы на ўсе стараньні іх дэлегацыяў ў Парыжу ў 1919 г., дабіцца незалежнасьці — уласнай дзяржаўнасьці. Украінцы асталія да свайго часу „недзяржаўным народам“ і, як і беларусы, апынуліся парэзанымі ды падзеленымі паміж рознымі „дзяржаўнымі народамі“, як „нацыянальныя меншасьці“. Толькі пасьля, як ведама, стварыліся на ўсходзе асяродкі іх уласнай дзяржаўнасьці, не ахапіўшай, аднак-жа, вялізарных частак этнаграфічных тэрыторыяў гэтых народаў. Прыкарпацкая Русь і Усх. Галіччына зьяўляюцца найбольш высуненай на Захад часткай этнаграфічнай тэрыторыі ўкраінцаў, падзеленай паміж Польшчай і Чэха-Славакіяй. Характэрную ролю палітычнага „цэмэнта“, як і ўсюдых, зрэшта, адыгралі гэтыя кавалкі пакрыўджаных ды падзеленых „недзяржаўнага народу“—украінцаў— у ўзаемных адносінах Чэха-Славакіі і Польшчы. Сьпярша, як ведама, адносіны паміж Чэха-Славакіяй і Польшчай былі вельмі дрэнныя. Даволі прыпомніць, якую ролю адыграла Чэха-Славакія ў часе бальшавіцкага наезду на Польшчу ў 1920 г., забараніўшы правоз транзытам ваеннага матэрыялу для Польшчы...

Але такія адносіны існавалі толькі да таго часу, пакуль ня быў вырашаны лёс Усходняй Галіччыны, як ведама „юрыдычна“ была Галіччына прызнана Вярхоўнай Радай (саюзьнікаў) і Радай Лігі Нацыяў „самастойнай адзінай“, аддадзенай толькі „пад мандат“ (за ўпраўленьне) Польшчы (пастановы Вярх. Рады 20/11-1919 г. і — Рада Лігі — 23/2 1921 г.), але фактычна была заваявана і далучана да сябе Польшчай. Дык чэха-славацкая палітыка, сьпярша ставіўшая палітычную стаўку на самастойную Галіччыну, якую пэўне-ж пражскія палітыкі лятуцелі перацягнуць на свой бок — праз нацыянальна-аднародную з ей Прыкарпацкую Русь, пасьля аружнага захвату Галіччыны Польшчай — пры „пасыўным абурэньні“ Лігі Нацыяў, — рэзка зьмяніла сваю „арыентацыю“, паставіўшы стаўку ўжо на Польшчу! Найлепш паказвае гэты паварот хроналёгія суадказных падзей.

Улетку 1921 г. высьветлілася, што вялікія дзяржавы ня будуць настайваць на выкананьні Польшчай пастановы Рады Лігі 23 лютага 1921 г. (аб самастойнасьці Усх. Галіччыны), а ўжо ў восені таго-ж году быў падпісаны паміж Польшчай і Чэха-Славакіяй трактат аб узаемным прыязным „нейтралітэце“ — на выпадак якога нападу, у якім Чэха-Славакія заявіла аб сваей „незаінтэрэсаванасьці справай Усходняй Галіччыны“. А гэты „трактат прыязьні“ чэхаў да палякаў, ці „акт здрады“ з боку чэхаў адносна ўкраінцаў, — даў магчымасьць Польшчы ўжо цалком і адкрыта анэксаваць Галіччыну, падзяліўшы яе на ваяводзтвы — замест наказаных Вярхоўнай Радай і Радай Лігі адзінства, і самастойнасьці (аўтаноміі) (гл. „статут для Усх. Гал.“, прыняты Соймам 26/9-1922г .).

Пасьля гэтай узаемнай перастрахоўкі дзьвюх дзяржаваў коштам падзеленага „недзяржаўнага народу“—шпарка пачынае дасьпяваць поўнае „сэрдэчнае паразуменьне“ Чэха-Славакіі з Польшчай дый роўналежна, ўсьцяж пагаршаецца палітыка пражскага ўраду адносна Прыкарпацкіх украінцаў!...

У „Трактаце 6-XI 1921 г. Чэха-Славакія і Польшча ўзаемна абавязаліся — не дапускаць на сваей тэрыторыі ваенных ды палітычных арганізацыяў, скіраваных проці тэрытарыяльнай нятыкальнасьці суседа“. Сьпярша гэта разумелася толькі, як узаемная адмова ад усялякіх прэтэнсіяў аднаго суседа на „Прыкарпацкую Русь“, а другога — на Усходнюю Галіччыну. Але пасьля, гэты Трактат стаў „разумецца“ значна шырэй. На яго падставе Чэха-Славакія стала — у доказ сваей шчырай прыязьні да Польшчы — тасаваць розныя рэпрэсіі адносна ў стасунку да сваіх украінцаў, пазбаўляючы іх навэт такіх правоў, якія маюць іншыя народы ў дзяржаве — на падставе яе канстытуцыі. Усё гэта робіцца галянтна — быццам дзеля таго, каб чэха-славацкім украінцам ня жылося лепш, як усходня-галіц. у Польшчы!..

Вось, якое палажэньне для ўкраінцаў Прыкарпацкай Русі фактычна стварылася ў „дэмакратычнай“ Чэха-Славацкай Рэспубліцы, слаўнай „шчырасьцяй і розумам“ сваіх дзяржаўнікаў... А цяпер варта паглядзець, якія-ж праўныя падставы існаваньня гэтага шматпакутнага Прыкарпацкага краю ў новай паваеннай рэспубліцы; краю, які так страшэнна цярпеў заўсёды ад вэнгерскіх магнатаў-абшарнікаў — у даваеннай Аўстра-Вэнгерскай манархіі.

Рэдактар-Выдавец: М. Масьцерко. Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.